Міхась Карпечанка



...пры ўсеагульнай пільнасьці
і падазронасьці на аматараў «стукнуць»
дэфіцыту не бывае...

# А душы іхнія купаюцца ў раі…

І ўсёж такі, як наіўна мне думалася: вось выдам нарэшце кнігу пра рапрэсаваных землякоў-бялынічанаў, і гэтая балючая тэма крыху саступіць месца на карысьць іншай ці іншых. Але ня тое тут было. Літаральна адразу ж па выхадзе кнігі “На скрыжаванні болі і надзеі” (Выдавец В. Хурсік) патэлефанавала жанчына, якая праз сьлёзы старэчым, гэтакім выразна бясьсільным, дарэшты падарваным голасам прасіла дапамагчы ёй высьветліць лёс загубленых у 30-я гады мінулага стагоддзя сваякоў.

Той бялынічанцы, Ефрасіньні Котавай, як высьветлілася пад час нашае гутаркі, нядаўна споўнілася 70 гадоў. Ефрасіньня Іванаўна прызналася, што дужа ня хоча, зусім не жадае таго, каб разам з ёй адышла, зьнікла, абарваўшыся назаўсёды, і тая танюсенькая нітачка радаводнае памяці, якую яна ад маленства тчэ-трымае ў сваіх, цяпер ужо нядужых, руках. Яна здаўна, хоць і без асаблівай настойлівасьці (таму ёсьць дастатковае вытлумачэньне), цікавілася лёсам свайго стрыечнага дзядулі Паўла Макаравіча Данільчыка.

Зьвестак пра яго ў Ефрасіньні Іванаўны назьбіралася ня так ужо й багата.

З адрывістых аповядаў маці, пачутых Ефрасіньняй у дзявоцтве, яна ўведала, што Паўла Макаравіча арыштавалі, калі ў Савецкім Саюзе правілі свой крывавы баль беззаконьне і цемрашальства. Амаль дзень у дзень з Паўлам забралі і яго пляменьніка Аляксея Данільчыка. Арыштавалі іх бялыніцкія НКУСаўцы, і бясьсьледна пазьнікалі людзі – нібыта на рэчцы ў палонку праваліліся.

Родным забраных нічога не было вядома пра далейшы лёс дзядулі і дзядзькі. Вочы свае праглядзеўшы на дарогу, гаравалі яны па гэты бок калючага дроту... Спачатку, праўда, цешылі сябе кволым спадзевам на сустрэчу, верылі, што ўсё ж такі возьме нарэшце верх праўда і справядлівасьць. А потым памерла і яна, гэтая дужа крохкая і такая важная для ўсіх, хто заставаўся на волі, надзея. Так вось і жылі – з пякучым болем і ліпкім страхам.

Аднойчы, а здарылася тое ў 1989 годзе, Ефрасіньня Котава адчула, як даўно памерлы ў ейным сэрцы спадзеў нібыта пачаў ажываць: яна даведалася, што па заключэньні пракуратуры Магілёўскай вобласьці Аляксей Уласавіч Данільчык рэабілітаваны, перастаў лічыцца «ворагам народу». Нават у раённай газеце пра гэта паведамілі. Але ж пякучаю стрэмкаю ў сэрцы абудзіўшыся, забалела яшчэ адно нямое пытаньне: «За што загінуў, за што адпакутаваў чалавек?»

Каму задаць яго, Ефрасіньня Іванаўна ня ведала, дый стрымліваў страх... Хоць і разумела, што васьмідзесятыя – гэта не трыццатыя. А вось жа сэрца, душа ў тыя трызьненьні галавы ня дужа верылі... Што ж, як гаворыцца, гены пальцамі, як і салодкімі абяцаньнямі ды цьвёрдымі запэўніваньнямі ўладу трымаючых, выціснуць немагчыма.

А наконт долі стрыечнага дзядулі заставалася суцэльная невядомасьць. Імгненьні, а, можа, й некалькі гадоў ягонага зламанага пасьля арышту жыцьця па-ранейшаму заставаліся цёмнаю плямай на полі памяці агранома па адукацыі Ефрасіньні Котавай.

Тады, раптоўна абнадзеяная, яна зараней пасьпяшалася паспадзявацца, што ня сёньня, дык заўтра абавязкова будзе рэабілітаваны і Павел Макаравіч. Думалася ёй: калі так жвава і, што важна, – галосна пачалася гэта справядлівая і даўно чаканая справа па вяртаньні добрых імёнаў рэпрэсаваных, аднаўленьні памяці пра іх, то наўрад, каб узьніклі нейкія сур'ёзныя перашкоды. Дойдзе чарга, марылася ёй, і да Паўла Данільчыка. Гэта ж мільёны справаў трэба перагледзець!

Ды тое дужа чаканае адносна пасьмяротнага лёсу дзядулі «раптам», наперад сказаўшы, зацягнулася для Ефрасіньні Котавай без малога на два дзесяцігоддзі.

– Пеpажыўшы страх трыццатых гадоў, – быццам угадаўшы мае гэтыя маўклівыя развагі, апавядае Ефрасіньня Іванаўна, – родныя рэпрэсаваных працягвалі баяцца. Нягледзячы на асуджэньне культу Сталіна, у іхніх сэрцах пастаянна жыў страх – боязь за сябе, за сваіх дзяцей, за сваякоў літаральна перасьледавала людзей... Таму многія свой чорны боль не выносілі са сваіх сэрцаў. Не выключэньнем стала і нашая сям'я. Ад маці я ведала, што дзядуля Павел і дзядзька Аляксей восеньню 1937 году былі арыштаваныя за нібыта антысавецкую агітацыю. Дзядулю было тады 58 гадоў, яго пляменьніку Аляксею – 38. Вырасьціла Аляксея адна маці: яго бацька рана памёр. Ён быў аднаасобнікам, шчыраваў на сваім кавалку зямлі і ўпарта не хацеў станавіцца калгасьнікам. А дзед Павел служыў сьвятаром у Антона-Буднянскай царкве, што ў Лебядзянкаўскім сельсавеце Бялыніцкага раёну, быў у сане іераманаха, і людзі яго ведалі пад царкоўным іменем Пахомій. Матуля згадвала, што Аляксея арыштавалі за канфлікт з нейкім начальствам. Ён вяртаўся па дарозе з поля да хаты, а тыя ехалі ў вазку. Начальнічкі нібыта запыталіся ў яго, дзе знаходзіцца нейкая патрэбная ім вёска.

Аляксей Уласавіч адказаў: «Супраць неба на зямлі!» Тыя, мусібыць, палічылі гэта за антысавецкую агітацыю і напісалі данос.

...Ефрасіньня Котава нарэшце-ткі адолела ўласную нерашучасьць і напрыканцы мінулага году пісьмова зьвярнулася ва ўпраўленьне КДБ па Магілёўскай вобласьці.

Неўзабаве адтуль прыйшоў адказ, які і праліў сьвятло на лёс родных людзей. Пачытаем яго і мы:

"Павел Макаравіч Данільчык (10. 01.1879 г.н. (у іншым выпадку – 1875), ураджэнец вёскі Ланькаў Бялыніцкага раёну, беларус, беспартыйны, непісьменны быў арыштаваны 29 красавіка 1935 году Бялыніцкім РА НКУС па абвінавачваньні ў правядзеньні антысавецкай агітацыі.

У чэрвені 1935 году ў сувязі з непаўнатой праведзенага расьсьледваньня крымінальная справа ў адносінах да П. М. Данільчыка вернутая на дасьледваньне, пры гэтым ён быў вызвалены з-пад варты пад падпіску аб нявыезьдзе, аднак з-пад сьледства схаваўся.

21 верасьня 1937 году П. М. Данільчык быў паўторна арыштаваны Бялыніцкім РА НКУС БССР, а 9 кастрычніка 1937 году па пастанове Асобай тройкі НКУС БССР прызнаны вінаватым ва ўчыненьні злачынства, прадугледжанага артыкулам 72 Крымінальнага кодэксу БССР і падвергнуты вышэйшай меры сацыяльнай абароны – расстрэлу з канфіскацыяй маёмасьці, якая належыць яму.

Прысуд прыведзены ў выкананьне 4 лістапада 1937 году ў горадзе Магілёве.

На момант першага арышту П. М. Данільчык зьяўляўся сьвятаром Антонава-Будзянскай (так напісана ў дакуменце. Правільна: Антонава-Буднянскай, – *М. К.)* царквы, жыў у вёсцы Антонава Буда.

Паводле сямейнага становішча – халасты.

Рэабілітаваны П. М. Данільчык па заключэньні пракуратуры Магілёўскай вобласьці **19 сьнежня 2006** (выдзелена мною, – *М. К*) году...»

Відавочна адно: уся «віна» Паўла Макаравіча заключалася толькі ў тым, што ён быў сьвятаром.

Бальшавікі, як вядома, захапіўшы ўладу, імкнуліся стварыць уласную рэлігію з культам свайго "бога-чалавека" Сталіна. Зразумела, што канкурыраваць з традыцыйнымі рэлігіямі яны не былі здатныя, а таму падышлі да вырашэньня і гэтага далікатнага пытаньня выключна з пазіцыі сілы: цэрквы парабавалі і пазачынялі, ператварыўшы іх у народныя дамы, склады ці гаражы альбо проста зруйнавалі. У Бялыніцкім раёне былі зачыненыя ўсе дваццаць хрысьціянскіх храмаў. А найвядомейшы і найпрыгажэйшы з іх – мураваны кармяліцкі касьцёл, які за царом (вясной 1876 году) быў перахрышчаны ў праваслаўную Раства Багародзіцкую царкву, – скарыстоўваўся пад народны дом, школу і нарэшце напрыканцы 70-х гг. мінулага стагоддзя ўзарваны з дапамогай жаночай брыгады Піцерскіх адмыслоўцаў-піратэхнікаў. Зараз засталіся толькі руіны Петрапаўлаўскай мураванай царквы ў Нежкаве, скасабочаныя і прагнілыя сьцены прымогілкавых капліцаў у Заазер'і, Старой Клёўцы ды Карытніцы. Ад усёй гэтай спадчыны захаваўся толькі адзіны касьцёл – сьвятога Людвіка ў Сьвяцілавічах. Выжыў дзякуючы таму, што спачатку выкарыстоўваўся як школа, а цяпер у ім месьцяцца праўленьне мясцовага сельгаскааператыву ды вясковае паштовае аддзяленьне. Сьвятароў аб'явілі «ворагамі народу» з усімі страшэннымі наступствамі для іх і іхніх сем'яў, саму веру абазвалі наркатычнай атрутай.

Вось у такой няпростай сітуацыі вымушаны быў жыць іераманах Пахомій з Антонава-Буднянскай царквы, многія шчырыя вернікі, якія станавіліся ахвярамі бессаромнага і жудаснага па сваёй сутнасьці наступальнага атэізму.

Бяспраўныя людзі і ў гэткім няпростым для сябе становішчы спрабавалі

захаваць сваю веру, рэлігійныя традыцыі, бараніліся ад закончаных бязбожнікаў пры ўладзе, а нярэдка аказвалі ім і супраціўленьне.

Згадваю нядаўнюю размову са шклоўскім краязнаўцам Алесем Грудзінам. Ён распавядаў пра адзін з яскравых узораў такога бяззбройнага, негвалтоўнага, супраціву, які дружна аказалі сваім прыгнятальнікам у красавіку 1927 году рабочыя мясцовай папяровай фабрыкі «Спартак».

“На фабрыцы, – распавядаў спадар Алесь, – быў скліканы гэтак званы дэлегацкі сход, каб разгледзець адно пытаньне: зрабіць 24 красавіка (Вялікдзень) працоўным днём. Яшчэ да правядзеньня яго сярод рабочых і членаў фабкаму адбыўся раскол. Большасьць з іх рашуча настойвалі на тым, каб сьвяткаваць Вялікдзень”.

Нядаўна ў адным з архіваў Алесю ўдалося адшукаць і пратакол таго сходу. Пачуўшы прапанову старшыні фабкаму Несьцяровіча аб пераносе сьвяткаваньня Вялікадня на 3 траўня, прысутныя ў зале закрычалі. Рабочы Хведар Чарняўскі ў сваім выступе рашуча заявіў: «...Яны хочуць нас адлучыць ад нашае веры, але мы сябе ў крыўду не дадзім».

Сход да канца не датрываў – рабочыя ў знак пратэсту пакінулі яго. Праз некалькі дзён па патрабаваньні абураных работнікаў фабрыкі была праведзеная канферэнцыя. Але на знак пратэсту супраць зьмены парадку дня яе большасьць рабочых сышла. На канферэнцыі трымаў слова і рабочы-каталік Станіслаў Сарока, які сказаў: «Для мяне асабіста ня важна тое, што я адсьвяткаваў свой Вялікдзень. Для мяне важна, каб Вялікдзень сьвяткавалі ўсе вернікі – як каталікі, так і рускія – нам у гэтых адносінах трэба злучыцца і ня слухаць розных... камуністаў». У выніку, рабочыя шклоўскай папяровай фабрыкі «Спартак» атрымалі перамогу: на Вялікдзень 1927 году, 24 і 25 красавіка, фабрыка не працавала.

У 1937 годзе, заўважае Алесь Грудзіна, шклоўшчыну страсянулі масавыя выступы сялянаў за адкрыцьцё раней зачыненых храмаў. На сьвята Дабравешчаньня, да прыкладу, у вёсцы Нічыпаравічы сабраліся болын за 500 сялянаў, якія запатрабавалі адчыніць мясцовую царкву. Ажыўленьне сялянаў назіралася таксама і ў вёсках Стары Шклоў, Барэцькі і шэрагу іншых. Зразумела, улада хутка выявіла арганізатараў гэтых «беспарадкаў», арыштавала і абвінаваціла іх у антысавецкай і контррэвалюцыйнай дзейнасьці.

Аднак, на гэтым расправа ня скончылася. Увосень 1937 году хваля арыштаў пракацілася па каталіцкім асяродку жыхароў вёскі Фашчаўка. Ксёндз Пётра Януковіч, арганіст Марцін Сякацкі, старшыня касьцельнага камітэту Ігнат Давідовіч, бацька і сын Крупенькі і яшчэ дзевяць найболын актыўных парафіянаў апынуліся ў лёхах раённага аддзелу НКУС. Пасьля судовага працэсу над імі, які апісваўся ў газеце, мабыць, для застрашэньня астатніх, напрацягу аднаго тыдня ўсе арыштаваныя каталікі з Фашчаўкі былі расстраляныя.

Алесь Грудзіна ўстанавіў прозьвішчы яшчэ 10 праваслаўных і каталіцкіх сьвятароў, рэлігійных актывістаў Шклоўскага раёну, якія былі расстраляныя за сваю веру і непахіснасьць, і дванаццаці асуджаных за гэта.

У зьвязку з пачутым прыгадаўся яшчэ адзін дзікунскі выпадак, які здарыўся ў бялыніцкай вёсцы Карытніцы і таксама на Вялікдзень, але ўжо ў 1931 годзе. Напрыканцы зімы вяскоўцаў у добраахвотна-прымусовым парадку сагналі ва ўтвораны калгас. Стаў членам арцелі і гаспадарлівы, працавіты і надзвычай набожны Раман Зносак. Адвёў у грамадскі хлеў пару ўласных коней, некалькі кароў і парсюкоў, добры гурт авечак, адмовіўся на карысьць калгасу і ад дагледжаных і апрацаваных дванаццаці гектараў зямлі. Шчыраваў у камуне гэтак жа старанна, як крыху раней тое ж самае рабіў і ў сваёй аднаасобніцкай гаспа-

дарцы. Толькі зрабіўся маўклівым. Але гэтая ягоная маўклівасьць зусім не зьяўлялася вонкавай прыкметай пакорлівасьці і паўнейшай падпарадкаванасьці.

Неўзабаве надарыўся і выпадак, калі Раман Хведаравіч праявіў рашучасьць і прынцыповасьць, паказаў свой характар.

Калгаснае начальства загадала падначаленым на Вялікдзень не сьвяткаваць, а працаваць. Раман Зносак атрымаў нарад араць поле. Зразумела, што Раман Хведаравіч, як і некаторыя яго аднавяскоўцы, наадрэз адмовіўся выконваць гэта дзікунскае распараджэньне закончаных бязбожнікаў.

Іх не чапалі, пакуль не завяршыліся палявыя работы. Яно і зразумела, калгасу патрэбная была рабочая сіла. На пачатку лета Рамана і некалькіх аднавяскоўцаў арыштавалі і пад канвоем адправілі ў Магілёў. А потым дабраліся і да іхніх сем'яў. На другі дзень Сёмухі ўсю Зносакаву сям'ю – жонку, трое дзяцей – арыштавалі. Не кранулі толькі 90-гадовага і зусім хворага Раманавага бацьку.

На падводах, абкружаных канваірамі, апынуліся таксама і сем'і Шамецькаў, Шыкаў, іншых аднавяскоўцаў...

У Магілёве на пляцы, абнесеным калючым дротам, гаротныя сем'і сустрэліся са сваімі раней арыштаванымі гаспадарамі і праз паўмесяца ў вагонах-«цялятніках» усе яны былі адпраўленыя на пакуты і пагібель у суровы Пермскі край...

Зазналі жахі ГУЛАГу і бялыніцкія сьвятары Пётра Дзянісавіч Бурдзіцкі, Уладзімір Аляксеевіч Ганчароў, амаль 70-гадовы Аляксей Васільевіч Касмачэўскі...

...А Паўла Данільчыка, як мы цяпер даведаліся, расстралялі.

Нельга не зьвярнуць увагу і на яшчэ адну балючую акалічнасьць лёсу вясковага сьвятара Паўла Данільчыка. Першы раз яго арыштавалі ў 1935 годзе, але праз нейкі час ён апынуўся на волі. У абвінаваўцаў не было канкрэтных доказаў ягонай антысавецкай агітацыі. Магчыма, на іераманаха Пахомія ніхто не напісаў, а, можа, нават і не пажадаў скласьці данос. У даведцы, якую атрымала Ефрасіньня Котава, напісана, што Павел Данільчык, адпушчаны на волю пад падпіску аб нявыезьдзе, схаваўся з-пад сьледства. Бачыце, ажно два гады яго не маглі адшукаць уніклівыя і ўсёведаючыя НКУСаўцы!

Аднак у гэта чамусьці ня верыцца.

Сьвятар у вёсцы, дзе так ужо склалася адвеку, што кожны ведае ўсё пра ўсіх і ўсе пра кожнага, – гэта вам не іголка ў стозе сена. А пры ўсеагульнай пільнасьці і падазронасьці на аматараў «стукнуць» дэфіцыту не бывае. Даходзіла, як вядома, нават да таго, што дзяцей прывучалі і ўсяляк заахвочвалі выкрываць «шкоднасьць» сваіх жа бацькоў. Ня трэба забывацца і на тое, што, вобразна кажучы, «стук» надзвычай пільных грамадзянаў амаль заўсёды хутчэй даносіцца ў патрэбныя ўстановы, чым сам гук.

Вось жыхар бялыніцкай вёскі Вялікі Кудзін Хведар Азараў у 1937 годзе нейкім цудам здолеў-ткі ўцякчы з Мурманскага канцлагеру. Дабраўся да сваёй сям'і. Але на свабодзе, хаваючыся ад пільнага чужога вока на гарышчы хаты, змог пабыць толькі каля дзесяці дзён.

Высачылі і данесьлі.

Дзеці, родныя Хведара Азарава і па сёньня ня ведаюць, дзе яго магілка...

У выпадку з Паўлам Данільчыкам можна дапусьціць, што НКУСаўцы проста на пэўны час «забыліся» на вернутую на дасьледваньне справу іераманаха Пахомія. Крывавая машына рэпрэсіяў не спынялася ні на хвіліну, і НКУСаўцам працы, канешне ж, хапала. Не сядзелі склаўшы рукі... А тут раптам ці праверка нейкая адбылася, ці самі спахапіліся альбо выпадкова натрапілі на незакончаную крымінальную справу... Магчыма, на гэты раз і «стукачок» ад усяго свайго паскуднага сэрца пашчыраваў.

Пры адсутнасьці канкрэтных фактаў правядзеньня антысавецкай агітацыі

П. Данільчыкам для НКУСаўцаў аказалася, відаць, вельмі дарэчы і гэтая, падараваная ім зьбегам абставінаў, акалічнасьць. Па іхняй логіцы выходзіла наступнае: калі сьвятар два гады быццам бы “скрываўся” ад органаў, значыць, – адчуваў сваю віну, значыць, – вінаваты. І гэтага для хуткай на расправу асобай тройкі НКУС БССР аказалася дастаткова, каб прыгаварыць невінаватага Паўла Данільчыка да «вышэйшай меры сацыяльнай абароны – расстрэлу».

Няма чалавека – няма і праблемаў. І іншым – выдатная навука на ўсё астатняе іхняе жыцьцё і жыцьці іх нашчадкаў.

Не была літасьцівай доля да Паўла Макаравіча і пасьля яго гвалтоўнай сьмерці. Яго рэабілітавалі толькі 19 сьнежня 2006 году – пасьля таго, як лёсам дзядулі зацікавілася Ефрасіньня Котава. Але ж напрыканцы 80-х у пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя рэабілітацыя ахвяраў беззаконьняў савецкай улады насіла, можна і так сказаць, самы што ня ёсьць масавы характар. Павел Данільчык тады чамусьці не патрапіў у тую плынь. Можа, проста не дайшла чарга? А гэты надзвычай патрэбны і важны для духоўнага ачышчэньня ўсяго грамадства працэс рэабілітацыі неўзабаве спынілі.

Дык вось, каб не актыўнасьць унучкі, так і застаўся б, відаць, і надалей пакутнік за веру Павел Макаравіч Данільчык «ворагам народу».

Аляксей Данільчык быў рэабілітаваны па заключэньні пракуратуры Магілёўскай вобласьці 20 верасьня 1989 году – роўна праз 52 гады пасьля таго, як апынуўся ў лёхах Магілёўскай турмы. Толькі цяпер, дзякуючы стараньням Ефрасіньні Котавай, сваякам яго стала вядома, што Аляксей у 1936 годзе два месяцы знаходзіўся пад арыштам за аказаньне супраціўленьня ўладам. Мабыць, сядзеў ці не за той свой недарэчны жарт наконт такога «дакладнага» ўказаньня месцазнаходжаньня вёскі. Увосень жа наступнага году А. У. Данільчыка забралі паўторна і – назаўсёды.

Аляксея Уласавіча абвінавацілі ў правядзеньні контррэвалюцыйнай прапаганды, а ўсё тая ж сумнавядомая і ўсюдыісная асобая тройка НКУС БССР на другі дзень пасьля таго, як расстралялі яго дзядзьку Паўла Макаравіча, вызначыла меру пакараньня і яму: адправіла на 10 гадоў у выпраўленча-працоўны лагер.

На сёньня прыведзеная вышэй інфармацыя адносна лёсу Аляксея Данільчыка ўся. Не вядома, у якім лагеры ён адбываў пакараньне і што з ім сталася далей. Зьнік бяз сьледу яшчэ адзін чалавек. Толькі памяць аб ім засталася ў сэрцах родных і блізкіх.

– Ведаеце, – кажа Ефрасіньня Котава, – як толькі прачытала пісьмо з упраўленьня КДБ, адразу ж неяк лягчэй стала на маёй душы. Я адчуваю зараз нябачную прысутнасьць і дзядулі Паўла, і дзядзькі Аляксея. Нібыта іхнія бязьвінна загубленыя душы знаходзяцца побач са мной.

Па словах Ефрасіньні Іванаўны, вялікі інтарэс да лёсу загубленых сваякоў, апроч яе, выяўляюць таксама яшчэ двое яе дзяцей, унукі, сваякі, знаёмыя.

Котавы вырашылі свае пошукі не спыняць. Хочуць атрымаць і дакладныя зьвесткі пра лёс Аляксея Данільчыка, высьветліць у Магілёве канкрэтнае месца расстрэлу і апошняга прытулку Паўла Данільчыка.

І дапамажы ім, Божа, у гэтай высакароднай справе захаваньня памяці.